І.Д. КУЗЬМІНА

# МАЛЕНЬКІЯ ГЕРОІ ВЯЛІКАЙ ВАЙНЫ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыеэлектронікі вул. П. Броўкі, 6, г. Мінск, 220013, Рэспубліка Беларусь*

Амаль 70 гадоў ззяе мірнае неба над нашай роднай Беларуссю. За гэты час ужо вырасла не адно новае пакаленне людзей, якія не бачылі і не зведалі жахаў вайны. А тады, 22 чэрвеня 1941 года, фашысцкая авіяцыя інтэнсіўна бамбіла тэрыторыю Савецкага саюза, у склад якога ўваходзіла і Беларусь. Беларускі народ, як толькі мог, імкнуўся аберагчы сваіх дзяцей ад дарослых праблем, аддаліць іх ад ваенных дзеянняў, але вайна закранула ўсіх без выключэння. Дзеці рана сталелі, поруч з дарослымі ўдзельнічалі ў ваенных аперацыях. Многія з іх сталі сапраўднымі героямі. Яны былі і сувязнымі, і разведчыкамі, і дыверсантамі, дапамагалі медыцынскаму персаналу ў ваенных шпіталях, дзе не хапала рук, выконвалі любое даручанае ім заданне не горш за дарослых. Валя Коцік - піянер-герой, юны партызанразведчык, самы малады Герой Савецкага Саюза. На момант здзяйснення подзвігу яму было 14 гадоў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена яму пасмяротна. Лёня Голікаў - падлетак-партызан, Герой Савецкага Саюза. Марат Казей - піянергерой, юны партызан-разведчык, Герой Савецкага Саюза (пасмяротна). Зіна Партнова - савецкая падпольшчыца, партызанка, член падпольнай арганізацыі "Юныя мсціўцы"; разведчыца партызанскага атрада імя К.Я Варашылава на акупаванай гітлераўцамі тэрыторыі Беларускай ССР. Член ВЛКСМ з 1943 года. Герой Савецкага Саюза. Яны былі звычайнымі хлопчыкамі і дзяўчынкамі. Але ім выпала нарадзіцца ў незвычайны час. У трагічны час. І ён іх прымусіў стаць героямі. Дзеці-Героі. Дзеці і вайна... Два словы, якія ні ў якім выпадку не павінны стаяць побач. Дзеці вайны, маленькія героі і сведкі жахлівых падзей - гэта яскравы прыклад мужнасці, смеласці, гераізму для сённяшняга падрастаючага пакалення. Ваеннае дзяцінства:

Пажарышч незлічоныя сляды,
Ў лясах снарады, гільзы, порах, міны,
Дзіцячыя галодныя гады,
Дзяцінства нас пазбавіла вайна,
Хаця для шчасця ў свет прыходзяць дзеці,
Шмат лёсаў ўшчэнт знявечыла яна.
А колькі войн ідзе на белым свеце!

*Кузмина Ирина Дмитриевна,* студентка ФИТУ БГУИР
*Научный руководитель: Куракевич Наталья Ивановна,* кандидат исторических наук, доцент кафедры гуманитарных дисциплин.

Библиотека БГУИР